Патолічаў Нікалай Сямёнавіч

Патолічаў Нікалай Сямёнавіч — першы сакратар ЦК КП Беларусі — кандыдат у дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР па Мінскай сельскай выбарчай акрузе № 567.

Патолічаў Нікалай Сямёнавіч нарадзіўся ў 1908 годзе ў сям'і селяніна сяла Золіна Гарахавецкага раёна Владзімірскай вобласці. Бацька тав. Патолічава Н. С. у першыя гады рэвалюцыі добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію, у перыяд грамадзянскай вайны камандаваў кавалерыйскай брыгадай і ў 1920 годзе быў забіт у баі. У гэтым-жа годзе памёрла яго маці.

З 12-гадовага ўзросту тав. Патолічаў Н. С. пачынае сваё працоўнае жыццё. З 1921 па 1925 год ён працаваў у сельскай гаспадарцы і на сезонных работах па найму. Са студзеня 1925 па 1928 год вучыўся ў школе ФЗВ і працаваў на хімічным заводзе ў Горкаўскай вобласці.

У кастрычніку 1928 года тав. Патолічаў Н. С. быў прынят у члены КПСС.

З 1928 па 1931 год тав. Патолічаў Н. С. працаваў сакратаром камітэта комсамола хімічнага завода, затым — сакратаром Дзержынскага райкома ВЛКСМ Горкаўскай вобласці, сакратаром Варнянскага райкома ВЛКСМ Чэлябінскай вобласці, загадчыкам школы ФЗВ хімічнага завода ў Горкаўскай вобласці.

З 1931 па 1937 год тав. Патолічаў Н. С. вучыўся ў Маскоўскім тэхналагічным інстытуце і ў Ваеннай акадэміі. Пасля заканчэння акадэміі служыў у Совецкай Арміі.

У 1938 годзе тав. Патолічаў Н. С. быў вылучан на партыйную работу — адказным арганізатарам ЦК ВКП(б), а затым — парторгам ЦК ВКП(б) на шынным заводзе Яраслаўскага гумава-азбеставага камбіната, сакратаром Гумава-камбінацкага райкома партыі гор. Яраслаўля. Працуючы на гэтым участку, тав. Патолічаў Н. С. праявіў свае арганізатарскія здольнасці, заваяваў у партыйнай арганізацыі аўтарытэт і ў студзені 1939 года быў выбран першым сакратаром Яраслаўскага абкома і гаркома ВКП(б).

У снежні 1941 года ЦК ВКП(б) накіроўвае тав. Патолічава Н. С. у буйнейшы прамысловы раён краіны — на Урал, дзе ён працуе да 1946 года ў якасці першага

сакратара Чэлябінскага абкома і гаркома ВКП(б). У тыя гады Чэлябінская партыйная арганізацыя мабілізуе працоўных вобласці на паспяховае выкананне заданняў партыі і ўрада па расшырэнню і будаўніцтву новых прамысловых прадпрыемстваў і павелічэнню выпуску прадукцыі, неабходнай для фронта. За паспяховае выкананне заданняў Дзяржаўнага Камітэта Абароны па забесцячэнню ваеннай прамысловасці металам, а фронта — узбраеннем і боепрыпасамі, па будаўніцтву і ўводу ў дзеянне новых магутнасцей тав. Патолічаў Н. С. быў узнагароджан трыма ордэнамі Леніна і ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

З мая 1946 года тав. Патолічаў Н. С. працаваў сакратаром ЦК ВКП(б), а з сакавіка 1947 года — сакратаром ЦК КП(б) Украіны па сельскай гаспадарцы і нарыхтоўках.

У жніўні 1947 года Цэнтральны Камітэт ВКП(б) накіраваў тав. Патолічава Н. С. на работу ў якасці першага сакратара Растоўскага абласнога і гарадскога камітэтаў партыі. Растоўская партыйная арганізацыя паспяхова вырашае задачы па аднаўленню і развіццю прамысловасці і сельскай гаспадаркі, па павышэнню матэрыяльна-бытавога ўзроўню жыцця рабочых, калгаснікаў і служачых, мабілізуе працоўных на паспяховае выкананне вялікіх задач пасляваеннай пяцігодкі.

У ліпені 1950 года Пленум Цэнтральнага Камітэта КП(б)Б выбраў тав. Патолічава Н. С. першым сакратаром і членам бюро ЦК КП(б) Беларусі. Выконваючы ўказанні Цэнтральнага Камітэта КПСС, Комнартыя Беларусі ў апошнія гады ажыццяўляе рад мер па расшырэнню і будаўніцтву ў рэспубліцы буйных заводаў і фабрык, праводзіць работу па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню калгасаў, па расшырэнню сеткі навучальных устаноў, навукова-даследчых і культурна-асветных устаноў, праяўляе неабходныя клопаты аб павышэнні матэрыяльнага і культурнага ўзроўню працоўных.

На XXI з'ездзе Компартыі Беларусі тав. Патолічаў Н. С. зноў быў выбран членам ЦК КПБ, а на Пленуме ЦК — першым сакратаром ЦК КП Беларусі.

Тав. Патолічаў Н. С. — дэпутат Вярхоўнага Совета СССР першага, другога і трэцяга скліканняў, дэпутат Вярхоўнага Совета БССР, член Цэнтральнага Камітэта КПСС.

За заслугі перад Радзімай тав. Патолічаў Н. С. узнагароджан чатырма ордэнамі Леніна, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і пяццю медалямі.

Тав. Патолічаў Н. С. — верны сын Комуністычнай партыі, усе свае сілы, вялікі практычны вопыт і веды аддае вялікай справе будаўніцтва комунізма ў нашай краіне.

ПРЭЗІДЭНТСКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ